Нацыянальнай бібліятэка Беларусі перадала кнігі пра Беларусь у Лондан у межах дабрачыннай акцыі «Пра Беларусь — беларусам замежжа», паведамляе агенцтва «Мінск-Навіны». Мэта праекта — садзейнічанне распаўсюджванню інфармацыі пра Беларусь, папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў, якія адлюстроўваюць багацце яе гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны, а таксама пашырэнню інфармацыйнага ўзаемадзеяння з аб'яднаннямі беларускай дыяспары ў замежных краінах. Англа-беларускаму таварыству ў Лондане былі перададзены творы класікаў беларускай мастацкай літаратуры, а таксама выданні па гісторыі і культуры нашай краіны.